**Аляксандр АГЕЕЎ**

# РАТУШЫ БЕЛАРУСІ як аб'екты гістарычнай і культурнай спадчыны: падабенства і адметнасці лёсу

**Гарадское самакіраванне адыграла важную, а магчыма, і вырашальную ролю ў фарміраванні ў Еўропе дэмакратычнай свядомасці і грамадзянскай супольнасці. На беларускіх землях гэтыя працэсы звязаны з распаўсюджваннем магдэбургскага права. У канцы XIV ст. яно з'явілася на заходніх абшарах Беларусі, а ў наступным стагоддзі яго атрымалі значныя гарады на яе ўсходзе. Матэрыяльнымі маркерамі, якія сведчылі аб самакіраванні гарадоў, былі ратушы. У іх размяшчаліся магістраты — органы гарадскога самакіравання па магдэбургскім праве. Ратушныя будынкі ў Беларусі напаткаў розны лёс: адны ацалелі і дайшлі да нашага часу, іншыя былі моцна пашкоджаны і перабудаваны, большасць была знішчана, альбо знікла.**



**АГЕЕЎ Аляксандр Рыгоравіч.**

*Прафесар кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1960 г. у Шклове. У 1981 г. закончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А.А.Куляшова. Працаваў у сярэдняй школе, сістэме прафтэхадукацыі. У 1991 г. закончыў аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. У 1992 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Даследуе палітычную гісторыю Беларусі XX ст., гісторыю Магілёўшчыны, гісторыю адукацыі Беларусі. Аўтар каля 220 навуковых і навукова-метадычных публікацый, у тым ліку кнігі "Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне" (у суаўтарстве з А.А.Трусавым. (2-е выд. папр. і дап. Магілёў, 2010), укладальнік (разам з І.А.Пушкіным) зборнікаў навуковых матэрыялаў "Магдэбургскае права на Магілёўшчыне" (Магілёў, 2015); "Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання" (Магілёў, 2017).*

У канцы XVI — пачатку XVII ст. магдэбургскае права пачало ўжо ўспрымацца як агульнадзяржаўны эталон гарадскога самакіравання ў ВКЛ. Яно стварала вялікія магчымасці для развіцця і росту гарадоў, рамяства і гандлю, вызначала месца і стан гараджан у феадальным грамадстве, бараніла мяшчан ад уціску шляхты і вялікакняжацкай адміністрацыі, спрыяла саслоўнаму адзінству. Паводле падлікаў беларускага даследчыка А.Доўнара, з 1390 па 1762 г. магдэбургскім правам у розных яго варыянтах карысталіся больш за 50 гарадоў і мястэчак на тэрыторыі сучаснай Беларусі[1].

Сёння адрэстаўраваныя або цалкам адбудаваныя ратушы стаяць толькі ў сямі былых магдэбургскіх гарадах Беларусі: Віцебску, Магілёве, Мінску, Нясвіжы, Слоніме, Шклове, Чачэрску. У апошнія дзесяцігоддзі ў нашай краіне здзяйсняецца шэраг праектаў па рэстаўрацыі і адбудове зруйнаваных помнікаў архітэктуры, у тым ліку будынкаў ратуш. Адноўлены Мінская і Магілёўская ратушы, рэканструяваны Нясвіжская і Шклоўская, абмяркоўваюцца планы адбудовы Брэсцкай і Гродзенскай. Пры распрацоўцы праектаў аднаўлення страчаных помнікаў варта разгледзець і асэнсаваць вопыт рэгенерацыі і эксплуатацыі будынкаў беларускіх ратуш.

Праблема аўтэнтычнасці пры рэстаўрацыі, рэканструкцыі і рэгенерацыі беларускіх ратуш узнімалася намі ў ранейшых публікацыях. У сувязі з гэтым мы імкнуліся пазбегнуць паўтораў і падрабязна не тлумачылі розныя аспекты і тэрміны, асветленыя ў папярэдніх артыкулах[2]. А ў сваіх разважаннях найперш абапіраліся на гісторыю і вынікі аднаўлення ў 2008 г. Магілёўскай ратушы[3]. У 2017 г. мы зрабілі спробу комплексна параўнаць значнасць Віцебскай і Магілёўскай, а ў 2018 г. — Шклоўскай і Магілёўскай ратуш. Вынікі паказалі, што, нягледзячы на тое, што ў Віцебску і Шклове мы маем аўтэнтычныя помнікі, а ў Магілёве — копію старажыт-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

най ратушы, апошняя па шэрагу пазіцый не толькі не саступае Віцебскай і Шклоўскай, а нават мае перавагу, паколькі выконвае функцыю месца дзейнасці органа мясцовага самакіравання і паўнавартаснага грамадскага цэнтру, з'яўляецца важным мясцовым сімвалам і брэндам[4].

Зыходзячы з папярэдняга вопыту вывучэння праблемы, мы лічым цікавым і важным параўнаць лёс і выкарыстанне, найперш з пункту гледжання аўтэнтычнасці, ацалелых і адноўленых будынкаў ратуш беларускіх гарадоў. За прыклад узяты найбольш адметныя і значныя ратушы нашай краіны: Віцебская, Нясвіжская і Шклоўская, лёс якіх хаця і быў складаным, але адносна шчаслівым для будынкаў, а таксама Магілёўская і Мінская, зруйнаваныя ў XIX—XX стст. і адноўленыя ў пачатку XXI ст. Дзеля разумення аргументаў і ацэначных паказчыкаў важна вылучыць некаторыя асаблівасці будаўніцтва і гістарычнага лёсу аб'ектаў нашага даследавання.

### Нясвіжская ратуша

Найстаражытнейшай з ацалелых на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца Нясвіжская ратуша. Праз 10 гадоў пасля таго як кароль польскі і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый у 1586 г. падпісаў прывілей на магдэбургскае права Нясвіжу, у 1596 г. у горадзе была ўзведзена цагляная ратуша. Прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак меў шасціярусную вежу, якую завяршаў гранёны купал з ліхтаром. Пад час Паўночнай вайны ратуша згарэла, але была адбудаваная ў 1752 г. у стылі позняга барока. У выніку пажару 1836 г. моцна пацярпелі памяшканні другога паверха, а з шасці ярусаў вежы захаваліся толькі чатыры[5]. Будынак доўга стаяў у занядбалым стане. З канца XIX ст. і да 1939 г. тут знаходзіліся гарадская дума, павятовае стараства, паліцэйская і гарадская ўправы. Пасля Другой сусветнай вайны ў ратушы размясціўся раённы Дом культуры, пазней — Дом піянераў і школьнікаў, дзіцячая бібліятэка.

З 1997 па 2004 г. Нясвіжскую ратушу рэстаўравалі: яе фасады набылі свой першапачатковы выгляд, былі адноўлены верхнія ярусы вежы, якую ўпрыгожылі гарадскі гадзіннік і аглядальная пляцоўка. Інтэр'еры 2-га паверха ратушы рэканструявалі пад музейную экспазіцыю "Гарадское самакіраванне Нясвіжа XVIII — першай паловы XIX ст." Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж". На першым паверсе размясцілі дзіцячы адукацыйны цэнтр з тэатрам-батлейкай.

### Магілёўская ратуша

Магілёў атрымаў магдэбургскае права ад Стэфана Баторыя ў 1577 г. Доўгі час магістрат месціўся ў драўляных будынках ратушы, месцазнаходжанне якіх мянялася. Мураваны ратушны будынак быў узведзены напярэдадні Паўночнай вайны. Звязана гэта было з тым, што пасля антымаскоўскага паўстання 1661 г. Магілёў атрымаў новыя прывілеі, якія ўраўнавалі яго ў правах з Вільняй, а многія магілёўцы атрымалі шляхецтва. Першы камень у падмурак новай мураванай ратушы ўрачыста заклалі ў пачатку верасня 1679 г. У лістападзе 1681 г. будынак ратушы асвяцілі святары з Брацкага манастыра. У 1682 г. пачалося будаўніцтва ратушнай вежы. Але 1 верасня 1686 г. яна абвалілася. Толькі ў ліпені 1692 г. магілёўскі магістрат зноў распачаў будаўніцтва вежы перад будынкам ратушы, якую пабудавалі да 1698 г.[6]. Пасля скасавання магдэбургскага права ў часы Расійскай Імперыі ў ратушы месцілася гарадская дума і ўправа, пажарная каланча, бібліятэка. У гады Першай сусветнай вайны яе будынак выкарыстоўваўся як імператарская радыёстанцыя.

Магілёўская ратуша, якая стагоддзямі ўпрыгожвала горад, была пашкоджаная ў гады Вялікай Айчыннай вайны і, нягледзячы на пастановы аб яе рамонце, зруйнаваная ў 1957 г. На сёння няма рацыянальнага тлумачэння прычын гэтага акту вандалізму. Натуральна, што з цягам часу нарадзілася ідэя аднавіць страчаны помнік. У 1975 г. пачалася падрыхтоўка праекта аднаўлення ратушы. У 1992 г. быў выведзены нулявы цыкл. Але цяжкасці з фінансаваннем не дазволілі завяршыць будаўніцтва. Толькі ў жніўні 2007 г. на аб'екце зноў распачаліся будаўнічыя работы, скончаныя да пачатку ліпеня 2008 г.

### Віцебская ратуша

Першая драўляная ратуша был пабудавана ў Віцебску пасля надання яму магдэбургскага права ў 1597 г. За ўдзел мяшчан у паўстанні 1623 г. горад пазбавілі магдэбургскага права, а будынак ратушы разабралі. Толькі пасля вяртання права на самакіраванне ў 1644 г. ратушу ўзвялі наноў. На "Чарцяжы месца Віцебска" 1664 г. паказана першая графічная выява ратушы. Гэты двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак, пакрыты чатырохсхільным дахам і завершаны васьміграннай назіральнай вежай з купалам і шпілем.

Пад час раскопак археолагі знайшлі мураваныя сцены паўпадвала і першага паверха ратушы XVII ст., зробленыя з цэглы-пальчаткі і невялікіх камянёў. Другі паверх будынка і яго завяршэнне, хутчэй за ўсё, былі драўлянымі. Драўляная пабудова не раз знішчалася пажарамі. У XVIII ст. у яе інтэр'ерах знаходзіліся шыкоўныя кафляныя печы, абляцаваныя распісной "галандскай" кафляй, якую знайшлі ў ходзе раскопак.

У 1775 г. за адзін сезон Віцебская ратуша была цалкам перабудаваная. Гэта быў прамавугольны ў плане двухпавярховы мураваны будынак з чатырох'яруснай вежай у цэнтры галоўнага фасада. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. да бакавых фасадаў былі прыбудаваны двухпавярховыя мураваныя аб'ёмы, на першых паверхах якіх размясціліся гандлёвыя рады. У будынку знаходзіліся розныя ўстановы: паліцэйская ўправа, гаўптвахта, пажарны двор, а

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

з другой паловы XIX ст. — гарадская дума. Трэці паверх ратушы (для патрэб гарадской управы) і порцік галоўнага фасада былі ўзведзеныя ў пачатку XX ст. Цяпер у будынку ратушы размяшчаецца Віцебскі абласны краязнаўчы музей[7].

### Мінская ратуша

Мінск атрымаў права на будаўніцтва ратушы разам з наданнем яму ў 1499 г. вялікім князем літоўскім Аляксандрам прывілея на магдэбургскае права. Існаванне ратушнага будынка, у якім праходзілі пасяджэнні магістрата або рады, пацвярджаецца дакументамі XVI—XVII стст. Ён быў моцна пашкоджаны пажарам 1640 г., адбудаваны, але ў пачатку XVIII ст. зноў страціў сваё аблічча. Будынак ратушы быў адноўлены ў 1744 г., а ў канцы стагоддзя яго значна перабудавалі ў стылі класіцызму. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак быў накрыты пакатым вальмавым дахам. Рызаліт цэнтральнай часткі галоўнага фасада акцэнтаваны чацверыковай вежай, якая завяршалася купалам са шпілем, на якім мацаваўся флюгер. Рызаліт і тарцы аформленыя чатырохкалоннымі порцікамі іанічнага ордэра. У часы Расійскай Імперыі ў будынку знаходзіліся: магістрат, суд, гаўптвахта, паліцыя, архіў, а ў 1830-х гг. — музычная школа. У 1851—1857 гг. будынак ратушы, якая сімвалізавала свабоды ранейшых часоў, і сквер вакол яе былі знішчаны па распараджэнні расійскага імператара Мікалая I[8]. Паводле гарадскіх паданняў, гараджане царскі загад сабатавалі, і сімвал свабоды разбіралі вязні Пішчалаўскага замка.

Мінскую ратушу ў 2002—2003 гг. аднавілі на ранейшым месцы, вызначаным археалагічнымі раскопкамі. Унутраную планіроўку помніка поўнасцю не капіравалі, але імкнуліся захаваць яе найбольш каштоўныя элементы. Адноўлены будынак упрыгожвае 32-метровая вежа з гербам горада і гадзіннікам. Унутры ратушы працуюць дзве доўгатэрміновыя экспазіцыі Музея гісторыі горада Мінска: "Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет" і "Мінск сярод сяброў. Гарады — пабрацімы сталіцы Беларусі". У прыбудаванай да будынка галоўнай зале пад шкляным купалам змешчаны макет гістарычнага цэнтра Мінска пачатку XIX ст. На другім паверсе, дзе калісьці размяшчаўся магістрат, знаходзіцца зала для правядзення нарадаў і прыёму ганаровых гасцей, праводзяцца ўрачыстыя гарадскія мерапрыемствы. Будынак ратушы прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

### Шклоўская ратуша

Шклоў — унікальны беларускі горад, які мяняў месцазнаходжанне тры разы[9]. Магдэбургскае права ўводзілася ў гэтым горадзе як мінімум двойчы. Першы раз яно было нададзена Шклову яго ўласнікам Янам Хадкевічам — у 1574 г., калі мясцовы мешчанін Харытон Васільевіч быў прызначаны магдэбургскім войтам горада. Хутчэй за ўсё, у канцы XVI — XVII ст. магдэбургскае права тут працягвала дзейнічаць. У далейшым, верагодна, у першай палове XVIII ст., Шклоў яго страціў. У XVIII ст. магдэбургскае права яму надаў кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст III. Яго першы прывілей ад 7 кастрычніка 1750 г. застаўся нерэалізаваным, а вось другі прывілей, ад 10 красавіка 1762 г., быў уведзены ў жыццё. Для большай вагі наданне магдэбургскага права Шклову зацвердзіў сойм Рэчы Паспалітай у 1764 г.[10]

Першую ратушу ў другім Шклове (на тэрыторыі пазнейшай вёскі Рыжкавічы) пабудавалі ў 1597 г. Яна была драўляная, магчыма, часткова мураваная. Мураваны будынак ратушы ўзвялі на цэнтральнай плошчы Шклова-3 у комплексе з гандлёвымі радамі толькі ў канцы XVIII ст., найбольш верагодна, напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак (21х18 м) Шклоўскай ратушы пакрыты чатырохсхільным дахам і завершаны двух'яруснай васьміграннай вежай з пакатым купалам са шпілем. Агульная вышыня будынка — 43 м. На вежы ратушы меўся гадзіннік з боем. У першым паверсе быў зроблены скразны праезд, які вёў у двор гандлёвых радоў. Асноўныя службовыя памяшканні знаходзіліся на другім паверсе. Памеры гандлёвых радоў былі для таго часу вялікімі (60х40 м), што дазваляла размяшчаць вакол усяго комплексу 120 крам. Яны былі арыентаваныя ў двор і на вуліцу, што дазваляла выкарыстоўваць гандлёвую плошчу максімальна[11].

Будынак ратушы быў пашкоджаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час яго некалькі разоў спрабавалі адрэстаўраваць, але безвынікова. Толькі ў 1999—2000 гг. ратуша была адрэстаўравана. Былі адноўлены і гандлёвыя рады, у якіх цяпер знаходзіцца Шклоўская гімназія, а ў самім будынку ратушы з 2003 г. месціцца школьны гісторыка-краязнаўчы музей. Цяпер гэта найвялікшы па плошчы ратушны комплекс у нашай краіне.

З існуючых на сёння ў Беларусі мы не разглядаем толькі Чачэрскую і Слонімскую ратушы — з прычыны іх меншай значнасці для беларускага дыскурсу. Так, прыкладам, каменную ратушу ў Слоніме пабудавалі на Рынкавай плошчы ў сярэдзіне ці другой палове XVIII ст., але з-за адсутнасці дакументаў яе гісторыя даследавана недастаткова. Мураваную Чачэрскую ратушу пабудавалі ў XVIII ст. ужо пасля далучэння горада да Расійскай Імперыі па загадзе яго ўладальніка графа З.Чарнышова. Ратушу ў Чачэрску адрэстаўравалі ў 2003 г. і размясцілі ў ёй мясцовы гісторыка-этнаграфічны музей.

### Спроба параўнання

Перавага каштоўнасці ацалелых будынкаў Віцебскай, Нясвіжскай і Шклоўскай ратуш перад адноўленымі будынкамі Магілёўскай і Мінскай пры першым параўнанні відавочная: у Віцебску, Нясвіжы і Шклове

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мы маем аўтэнтычныя помнікі, а ў Магілёве і Мінску — копіі старажытных ратуш. Але не ўсё так адназначна. Адны спецыялісты вельмі крытычна выказваюцца аб стварэнні чарговых "новабудаў", а іншыя дастаткова высока ацэньваюць задуму і рэалізацыю праекта аднаўлення Мінскай і асабліва Магілёўскай ратушы.

Для таго каб разабрацца ў вытоках такіх супрацьлеглых ацэнак, трэба адзначыць, што ў сучасным дыскурсійным полі, у якім абмяркоўваюцца праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны, вартасці архітэктурных помнікаў і будынкаў, істотную ролю грае праблема аўтэнтычнасці. Так, супярэчлівыя ацэнкі каштоўнасці адноўленых Магілёўскай і Мінскай ратуш сталі адлюстраваннем аб'ектывісцкага і канструктывісцкага падыходаў да разумення сутнасці дэфініцыі "аўтэнтычны".

У сучаснай антрапалогіі, як правіла, вылучаюць два вызначэнні аўтэнтычнасці: як атрыбут, асаблівасць, унутрана ўласцівая дадзенай рэчы або тэхналогіі якасць і як становішча яе ў прасторы і часе. Другі падыход (канструктывісцкі) для нас асабліва важны, бо менавіта паводле яго вызначаюць прыналежнасць пабудовы да архітэктурнага комплексу ці гістарычнага ландшафту. У ім, у адрозненне ад першага, лічаць, што аўтэнтычнасць належыць не самім аб'ектам, а дыскурсам, якія ўзнікаюць з іх нагоды. У гэтым сэнсе аўтэнтычнасць заўсёды сацыяльна сканструяваная і зменлівая з'ява[12].

Паспрабуем ніжэй разгледзець праблему на прыкладзе Магілёўскай ратушы, абапіраючыся на вядомы ў антрапалогіі пастулат, згодна з якім гаварыць можна аб трох асноўных відах аўтэнтычнасці: па форме, функцыі і змесце.

**Месца.** Адноўлены будынак Магілёўскай ратушы стаіць на сваім спрадвечным месцы, якое было вызначана археалагічнымі раскопкамі.

**Форма.** Паводле сваёй формы і сілуэту адноўлены будынак даволі дакладна капіруе старажытную ратушу. А вось яго ўнутраная планіроўка істотна адрозніваецца. Яна прыстасаваная да сучасных патрэб. У апраўданне архітэктарам трэба адзначыць, што ўнутраная планіроўка будынка мянялася некалькі разоў з часоў узвядзення.

**Матэрыялы.** Нясучыя сценавыя канструкцыі адноўленага будынка складзены з блокаў ячэістага бетону і цэглы, што не зусім адпавядае аўтэнтычнаму, які быў узведзены выключна з цэглы.

**Функцыя.** Будынак ратушы сёння выкарыстоўваецца пад Музей гісторыі Магілёва і яму належыць. Экспазіцыя музея называецца "Магілёў у эпоху магдэбургскага права". Але ў будынка ёсць і іншая, што вельмі істотна, функцыя — у ратушы праходзяць сесіі Магілёўскага гарадскога савета дэпутатаў. У ёй таксама праводзяцца шматлікія афіцыйныя і грамадскія гарадскія мерапрыемствы, у тым ліку ўзнагароджанні, уручэнне прэміі "Дасягненне", урачыстыя прыёмы розных дэлегацый, канферэнцыі, прэзентацыі і г. д. Фактычна будынак функцыянуе як гарадскі грамадскі цэнтр. Такім чынам, адбылося адраджэнне элементаў функцыянальнай аўтэнтычнасці ратушы.

**Змест.** Сам па сабе новы будынак ратушы не ўяўляе асабістай каштоўнасці. Але ён робіцца вельмі значным, калі мы напаўняем яго істотным для нас зместам. Цудоўна, калі будынак мае сваю гісторыю, калі ён упісаны ў гістарычны кантэкст свайго месца, нібыта ўкаранёны ў яго гісторыю. Таму вельмі важныя тыя сімвалы, якія звязваюць гараджан з ратушай.

Па-першае, ратуша для магілёўцаў гістарычна была і застаецца сёння сімвалам гарадскога самакіравання. Па-другое, для гараджан яна даўно стала адным з сімвалаў шматвяковай гісторыі горада. Па-трэцяе, ратуша была і цяпер зноў стала адным з архітэктурных сімвалаў Магілёва. Па-чацвёртае: усё пералічанае выразна сведчыць аб еўрапейскасці Магілёва. Разбурэнне ратушы ў 1957 г. стала адным з трагічных сімвалаў варварскіх (часцяком на мяжы са злачыннасцю) адносін да архітэктурнай спадчыны ў савецкі час. І нарэшце, аднаўленне ратушы ў 2008 г. стала такой важнай падзеяй у жыцці Магілёва, яшчэ і таму, што гісторыя змагання за яе вяртанне сама пераўтварылася ў сімвал плённасці грамадскай ініцыятывы. Ратуша сёння не проста прыцягвае турыстаў і нагадвае магілёўцам аб слаўных часах магдэбургскага права, але адным сваім з'яўленнем абудзіла грамадскую актыўнасць гараджан.

Сёння і з фармальна-архітэктурнага, і з функцыянальнага пунктаў гледжання, і асабліва па змесце, можна гаварыць аб элементах адроджанай аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы. І з гэтых пазіцый маюць сэнс разважанні аб адраджэнні "помніка гісторыі"[13]. Менавіта так ацэньвае калектыў музея сваё месцазнаходжанне: *"Музей гісторыі Магілёва размяшчаецца ў будынку адноўленага помніка архітэктуры XVII стагоддзя — гарадской Ратушы"*[14].

Абапіраючыся на вышэйпрыведзеныя разважанні і аргументы, з дапамогай табліцы паспрабуем параўнаць будынкі, сэнсы і функцыі ратуш у Нясвіжы, Магілёве, Віцебску, Мінску і Шклове з пункту гледжання аўтэнтычнасці і ў кантэксце іх гісторыі:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Гістарычныя і ацэначныя паказчыкі | Нясвіжская ратуша | Магілёўская ратуша | Віцебская ратуша | Мінская ратуша | Шклоўская ратуша |
|---|---|---|---|---|---|
| **Год атрымання горадам магдэбургскага права** | 1586 г. | 1577 г. | 1597 г. | 1499 г. | 1574, 1762 гг. |
| **Матэрыял першых ратушных будынкаў** | Цагляная з 1596 г. | Драўляныя. | Драўляная. Пазней часткова мураваная. | Драўляная. Цалкам ці часткова мураваная з канца XVI ст. | Драўляная, магчыма часткова мураваная. Шклоў-2. |
| **Асноўныя першапачатковыя функцыі і задачы** | Размяшчэнне органа гарадскога самакіравання. Цэнтр гаспадарча-эканамічнага жыцця горада. Адміністрацыйна-публічная і прадстаўнічая. Месца правядзення судовых пасяджэнняў. Правядзенне разнастайных грамадскіх і культурных мерапрыемстваў. Вежа выкарыстоўвалася як назіральны пункт. | | | | |
| **Час пабудовы сучаснага мураванага будынка** | 1596 г. Перабудаваны ў 1752 г. | 1679—1681 гг., вежа — 1692—1698 гг. Адноўлены ў 2007—2008 гг. | 1775 г. | Канец XVIII ст. Адноўлены ў 2002—2003 гг. | 1770—1772 гг. |
| **Архітэктурны стыль, уласцівы помніку** | Вежавы тып. Познебарочныя і рэнесансныя рысы. | Вежавы тып. Барока, экстэр'еры перабудоўваліся ў канцы XVIII ст. у класічным стылі. | Вежавы тып. Віленскае барока. Перабудавана ў класічным стылі. | Вежавы тып. Перабудавана ў класічным стылі. | Вежавы тып. Класіцызм. |
| **Выкарыстанне будынка ў час уваходжання ў Расійскую Імперыю** | Для розных устаноў. | Магістрат, гарадская дума і ўправа, пажарная каланча, бібліятэка. | Паліцэйская ўправа, гаўптвахта, пажарны двор, з другой паловы XIX ст. — гарадская дума. | Магістрат, суд, гаўптвахта, паліцыя, архіў, а ў 1830 гг. — музычная школа. Знішчаны ў 1851—1857 гг. | Для розных устаноў. |
| **Выкарыстанне будынка ў міжваенны час** | З канца XIX ст. і да 1939 г. тут знаходзіліся гарадская дума, павятовае староства, паліцэйская і гарадская ўправы. | Нефункцыянальнае выкарыстанне для розных устаноў. | Нефункцыянальнае выкарыстанне пад абласны краязнаўчы музей. | — | Нефункцыянальнае выкарыстанне для розных устаноў. Аддзяленне ашчаднага банка[15]. |
| **Лёс будынка ў гады Вялікай Айчыннай вайны** | Пашкоджаны. | Пашкоджаны. | Пашкоджаны. | — | Пашкоджаны. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Гістарычныя і ацэначныя паказчыкі | Нясвіжская ратуша | Магілёўская ратуша | Віцебская ратуша | Мінская ратуша | Шклоўская ратуша |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лёс будынка пасля Вялікай Айчыннай вайны** | Захаваны. Дом культуры, пазней — Дом піянераў і школьнікаў, дзіцячая бібліятэка. | Зруйнаваны ў 1957 г. | Захаваны. Рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Абласны краязнаўчы музей. | — | Захаваўся, часткова адрамантаваны. Пажарная частка, гаргаз[16]. *Быў закінуты* і разбураўся. |
| **Лёс будынка ў Рэспубліцы Беларусь** | Адрэстаўраваны з 1997 па 2004 г. Адноўлены верхнія ярусы вежы. | Адноўлены ў 2007—2008 гг. | Захаваны. Абласны краязнаўчы музей. | Адноўлены ў 2002—2003 гг. | Адрэстаўраваны ў 1999—2000 г. Адноўлены гандлёвыя рады. |
| **Форма і матэрыялы сучаснага будынка** | Сапраўдныя. Верхнія ярусы вежы адноўленыя з сучасных матэрыялаў. | Месца і форма старажытныя, матэрыялы сучасныя. | Сапраўдныя. | Месца і форма старажытныя, матэрыялы сучасныя. | Сапраўдныя. Гандлёвыя рады рэканструяваныя з сучасных матэрыялаў у 1999—2000 гг. |
| ***Сённяшнія функцыі* і выкарыстанне** | Музейная экспазіцыя "Гарадское самакіраванне Нясвіжа *XVIII — першай паловы* XIX ст." Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж" | Месца правядзення сесій гарсавета, некаторыя прадстаўнічыя функцыі. Музей *гісторыі Магілёва*. Экспазіцыя "Магілёў у эпоху магдэбургскага права". Гарадскі грамадскі цэнтр. | Абласны краязнаўчы музей. | Некаторыя прадстаўнічыя функцыі. Музей гісторыі горада Мінска. Часткова гарадскі грамадскі цэнтр. | Выкарыстоўваецца Шклоўскай гімназіяй пад школьны этнаграфічна-краязнаўчы музей. |
| **Сімвалічнасць, змест, дух** | Гістарычны сімвал горада. Сімвал гарадскога самакіравання. Сімвал самастойнасці і свабоды гараджан. Архітэктурная дамінанта і гарадскі сімвал. Сімвал еўрапейскасці. | | | | |
| | | Сімвал нецывілізаваных адносін да гістарычнай спадчыны ў савецкія часы. Сімвал плённасці грамадскай ініцыятывы ў справе адраджэння і захавання спадчыны. | | | Сімвал нецывілізаваных адносін да гістарычнай спадчыны ў савецкія часы. Сімвал плённасці грамадскай ініцыятывы ў справе адраджэння і захавання спадчыны. |
| **Даступнасць для жыхароў горада** | Даступна. | Даступна. | Даступна. | Даступна. | Абмежавана даступна. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Параўнальны аналіз паказвае, што лёс гэтых ратуш шмат у чым падобны. Да канца XVI ст. вялікія беларускія гарады мелі пераважна драўляныя ратушы, якія будаваліся ў адпаведнасці з атрыманымі прывілеямі і перыядычна знішчаліся пажарамі. Па меры ўзмацнення эканамічнага становішча гарадоў узводзіліся мураваныя ратушы. Як правіла, беларускія ратушы былі вежавага тыпу і будаваліся ў эпоху барока. У час класіцызму адбывалася перабудова будынкаў або змена іх экстэр'ераў.

Ратушы выконвалі вельмі важныя функцыі і задачы: у іх размяшчаліся органы гарадскога самакіравання, праводзіліся судовыя пасяджэнні, разнастайныя грамадскія і культурныя мерапрыемствы; яны служылі цэнтрам гаспадарча-эканамічнага жыцця горада; выконвалі адміністрацыйна-публічныя і прадстаўнічыя функцыі. Вежы ратушных будынкаў выкарыстоўваліся як назіральныя пункты.

У часы Расійскай Імперыі ў сувязі з ліквідацыяй гарадскога самакіравання практыкавалася нефункцыянальнае выкарыстанне будынкаў ратушы для розных устаноў, часткова пад органы гарадскога кіравання. Памяншэнне значнасці ўстаноў, якія месціліся ў ратушах, пачало адбівацца на іх лёсе. Адбыліся першыя страты пабудоў. Так, у 1851—1857 гг. быў зруйнаваны будынак Мінскай ратушы. Пасля пажару 1836 г. вежу Нясвіжскай ратушы паменшылі з шасці да чатырох ярусаў.

Для савецкага часу было таксама ўласціва нефункцыянальнае выкарыстанне ратушных збудаванняў, няўвага да рамонту і рэстаўрацыі, паступовы заняпад і знішчэнне асобных будынкаў. У выніку пацярпела ратуша ў Шклове, была знішчана ў 1957 г. Магілёўская ратуша. Толькі ратушныя будынкі ў Віцебску і Нясвіжы, у якіх знаходзіліся ўстановы культуры, дагледаліся.

Пасля пачатку перабудовы абвастрылася ўвага грамадскасці, а затым і ўладаў да гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Праекты аднаўлення пачалі набываць канкрэтнасць пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Першым распачалося аднаўленне Магілёўскай ратушы — у 1992 г., але яно зацягнулася да 2008 г. Першай у Беларусі была ўратавана ад разбурэння і рэстаўравана Шклоўская ратуша ў 1999—2000 гг. Нясвіжскую ратушу аднаўлялі на працягу 1997—2002 гг. Мінская была адбудаваная ў 2002—2003 гг. Чатыры з пяці ратуш атрымалі другое жыццё ў гады незалежнасці.

Усе ратушы валодалі і валодаюць моцнай сімвалічнасцю. Яны з'яўляюцца гістарычнымі і архітэктурнымі сімваламі сваіх гарадоў, сімваламі гарадскога самакіравання, самастойнасці і свабоды гараджан і еўрапейскасці. Апошняя якасць была хутка асэнсавана грамадскасцю і пачала выкарыстоўвацца і прапагандавацца ў сродках масавай інфармацыі. Невыпадкова ва ўсіх пяці будынках размяшчаюцца музейныя экспазіцыі. Магілёўская і Шклоўская ратушы нагадваюць аб нецывілізаваных адносінах да гістарычнай спадчыны ў савецкі час, з'яўляюцца сімвалам плённасці грамадскай ініцыятывы ў справе адраджэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны.

Парадаксальна, але, параўноўваючы лёс, стан і эксплуатацыю ратушных будынкаў, можна прыйсці да высновы, што не па ўсіх пазіцыях адноўленыя Магілёўская і Мінская ратушы сёння саступаюць Віцебскай, Нясвіжскай або Шклоўскай, а па некаторых маюць і перавагу. Безумоўна, ацалелыя будынкі ратуш з'яўляюцца па форме і матэрыяле помнікамі архітэктуры, затое ў Магілёве і Мінску ім часткова вярнулі традыцыйную функцыянальнасць, адрадзілася іх сімвалічнасць. І з фармальна-архітэктурнага, і з функцыянальнага пунктаў гледжання, і па змесце можна гаварыць аб элементах адроджанай аўтэнтычнасці нанава адбудаваных ратуш. Менавіта на гэтых падставах за будынкам Мінскай ратушы афіцыйна замацаваны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Найбольш удала, на наш погляд, на сённяшні дзень выкарыстоўваецца Магілёўская ратуша, якая выконвае функцыю месца дзейнасці органа мясцовага самакіравання і паўнавартаснага грамадскага цэнтру, з'яўляецца вельмі важным мясцовым сімвалам і брэндам. У ратушы праходзяць шматлікія афіцыйныя і грамадскія мерапрыемствы. А тое, што шлях да адбудовы ратушы ў Магілёве быў няпростым і пакручастым, што мясцовай грамадскасці на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў давялося прыкладаць вялікія намаганні для папулярызацыі гэтай ідэі, што, па сутнасці, была арганізавана грамадская кампанія па яе аднаўленні, спрыяла яе папулярнасці. Можа, менавіта дзякуючы гэтаму яна такая блізкая сэрцу і дарагая магілёўцам. У выніку яе адбудова ў 2008 г. стала падзеяй года і штуршком да развіцця грамадскай ініцыятывы ў горадзе.

Паступова знаходзіць сваё месца ў жыцці сталіцы Беларусі Мінская ратуша. Ужо сёння ў яе будынку праводзяцца розныя ўрачыстыя мерапрыемствы гарадскога і дзяржаўнага значэння. Штогод менавіта ў ратушы адкрываецца Свята горада. Але да апошняга часу яна была маладаступнай для грамадскасці і малафункцыянальнай. Толькі з другой паловы 2018 г. ратуша была адкрыта для наведвальнікаў і турыстаў.

Для Нясвіжскай, Віцебскай і Шклоўскай ратуш, з улікам іх архітэктурнай і гістарычнай вартасці, неабходна прадумаць магчымасць частковага вяртання функцыянальнай аўтэнтычнасці.

Досвед рэстаўрацыі, рэгенерацыі і эксплуатацыі будынкаў беларускіх ратуш варты параўнання і асэнсавання, паколькі, аднаўляючы страчаныя сакральныя ці грамадзянскія будынкі, важна памятаць не толькі пра іх форму, але і пра першапачатковыя функцыі і напаўняць зместам, які адпавядае іх гістарычнаму лёсу. Апошняе істотна як для новых праектаў, так і для паспяховага плённага жыцця існуючых ратушных будынкаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

[1] Доўнар А. Магдэбургскае права // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя. Т. 2. Мінск, 2006. С. 241—242.

[2] Агееў А.Р. Магілёўская ратуша: гісторыя адраджэння і яе ўрокі // ARCHE. 2010. № 3. С. 342—362; Агееў А.Р. Праблема аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы. Погляд гісторыка // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: У 5 частках. Ч. 2: Праблемы архітэктуры, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: мат. Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі: г. Мінск, 25—26 красавіка 2013 г. Мінск, 2013. С. 6—11; Агееў А. Рэгенерацыя гістарычнага ландшафту Магілёва і праблема аўтэнтычнасці Магілёўскай ратушы як сімвала магдэбургскага права // Ад Магдэбургскага права да сучаснага самакіравання: зборнік навуковых матэрыялаў. Магілёў, 2017. С. 71—88.

[3] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне. 2-е выд. Магілёў, 2010.

[4] Агееў А.Р. Віцебская і Магілёўская ратушы: падабенства і адметнасці лёсаў // Актуальные проблемы источниковедения: материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права, Витебск, 20—21 апреля 2017 г. Витебск, 2017. С. 356—359; Агееў А.Р. Магілёўская і шклоўская ратушы: ў пошуку аўтэнтычнасці // Шклоў і Шклоўскі раён. Мінск, 2020. С. 93—99.

[5] Габрусь Т.В. Нясвіжская ратуша і гандлёвыя рады // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 11. Мінск, 2000. С. 415.

[6] Агееў А.Р., Трусаў А.А. Магілёўская ратуша... С. 28—32.

[7] Чарняўскі І. Віцебская ратуша // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мінск, 1994. С. 326—327.

[8] Дзянісаў У. Мінская ратуша // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мінск, 1999. С. 179—180.

[9] Левко О.Н. Средневековые территориально-административные центры Северо-Восточной Беларуси: Формирование и развитие. Минск, 2004. С. 30—34, 106.

[10] Доўнар А.Б. Увядзенне магдэбургскага права ў Шклове 1574 і 1762 гг. // Архіварыус. Вып. 14. Мінск, 2016. С. 246—254.

[11] Агеева Л. Шклоўская ратуша // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. II. Мінск, 2003. С. 206.

[12] Падрабязней гл.: Рыжакова С.И. "Хлебные мантры" и "японские чаши" у латышей. К вопросу о проблемах аутентичности и "регистрах истинности" в современной этнографии // Этнографическое обозрение. 2006. № 1. С. 118—121.

[13] Агееў А. Рэгенерацыя гістарычнага ландшафту... С. 79—85.

[14] Музей гісторыі Магілёва. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://museumhm.by/muzej-gistoryi-magiljova/ Дата доступу: 21.06.2020.

[15] Па інфармацыі шклоўскага краязнаўцы А.Грудзіны.

[16] Па інфармацыі шклоўскага краязнаўцы А.Грудзіны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова